Пралетары ўсіх краін, еднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення Віленскай Акругі

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 1
22 верасня 1939 г.
пятніца

Горача вітаем Чырвоную Армію, Савецкі ўрад і таварыша Сталіна за аказаную нам дапамогу ў вызваленні ад польскіх паноў і капіталістаў

З прамовы па радыё Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыша В. М. Молатава

17 верасня 1939 г.

Таварышы! Грамадзяне і грамадзянкі нашай вялікай краіны!

Падзеі, выкліканыя польска-германскай вайной, паказалі ўнутраную несастаяцельнасць і яўную нядзеездольнасць польскай дзяржавы. Польскія правячыя кругі абанкроціліся. Усё гэта адбылося за самы кароткі тэрмін.

Прайшло якіх-нібудзь два тыдні, а Польшча ўжо страціла ўсе свае прамысловыя ачагі, страціла большую частку буйных гарадоў і культурных цэнтраў. Няма больш і Варшавы, як сталіцы польскай дзяржавы. Ніхто не ведае аб месцапрабыванні польскага ўрада. Насельніцтва Польшчы кінута яго незадачлівымі кіраўнікамі на волю лёсу. Польская дзяржава і яе ўрад фактычна перасталі існаваць. У сілу такога становішча заключаныя паміж Савецкім Саюзам і Польшчай дагаворы спынілі сваё дзеянне.

У Польшчы стварылася становішча, якое патрабуе з боку Савецкага ўрада асобых клопатаў у адносінах безапаснасці сваёй дзяржавы. Польшча стала зручным полем для ўсякіх выпадковасцей і нечаканасцей, якія могуць стварыць пагрозу для СССР. Савецкі ўрад да апошняга часу аставаўся нейтральным. Але ён у сілу ўказаных акалічнасцей не можа больш нейтральна адносіцца да стварыўшагася становішча.

Ад Савецкага ўрада нельга таксама патрабаваць абыякавых адносін да лёсу адзінакроўных украінцаў і беларусоў, якія пражываюць у Польшчы і раней знаходзіліся на становішчы бяспраўных нацый, а цяпер і зусім кінуты на волю выпадку. Савецкі ўрад лічыць сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам-украінцам і братам-беларусам, якія насяляюць Польшчу.

З прычыны ўсяго гэтага ўрад СССР перадаў сёння раніцою ноту польскаму паслу ў Маскве, у якой заявіў, што Савецкі ўрад аддаў распараджэнне Галоўнаму Камандванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Савецкі ўрад заявіў таксама ў гэтай ноце, што адначасова ён мае намер прыняць усе меры к таму, каб вызваліць польскі народ са злапалучнай вайны, куды ён быў увергнут яго неразумнымі кіраўнікамі і даць яму магчымасць зажыць мірным жыццём.

У першых чыслах верасня, калі праводзіўся частковы прызыў запасных у Чырвоную Армію на Украіне, у Беларусі і яшчэ ў чатырох ваенных акругах становішча ў Польшчы было няясным, і гэты прызыў праводзіўся, як мера перасцярогі. Ніхто не мог думаць, што польская дзяржава выявіць такое бяссілле і такі быстры развал, які цяпер ужо мае месца ва ўсёй Польшчы. Паколькі, аднак, гэты развал у наяўнасці, а польскія дзеячы поўнасцю абанкроціліся і няздольны змяніць становішча ў Польшчы, наша Чырвоная Армія, атрымаўшы буйнае папаўненне по апошняму прызыву запасных, павінна з чэсцю выканаць пастаўленую перад ёю пачотную задачу.

Урад выражае цвёрдую ўпэўненасць, што наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія пакажа і на гэты раз сваю баявую магутнасць, свядомасць і дысцыпліну, што выкананне сваёй вялікай вызваленчай задачы яна пакрые новымі подвігамі, гераізмам і славай.

Разам з тым, Савецкі ўрад прэпраўадзіў копію сваёй ноты на імя польскага пасла ўсім урадам, з якімі СССР мае дыпламатычныя адносіны, і пры гэтым заявіў, што Савецкі Саюз будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў адносінах усіх гэтых краін.

Гэтым вызначаюцца нашы апошнія мерапрыемствы па лініі знешняй палітыкі.

Наша задача цяпер, задача кожнага рабочага і селяніна, задача кожнага служачага і інтэлігента, заключаецца ў тым, каб чэсна і самаадданна працаваць на сваім пасту і тым аказваць дапамогу Чырвонай Арміі.

Што датычыць байцоў нашай слаўнай Чырвонай Арміі, то я не сумняваюся, што яны выканаюць свой абавязак перад радзімай — з чэсцю і са славай.

Народы Савецкага Саюза, усе грамадзяне і грамадзянкі нашай краіны, байцы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота згуртаваны, як ніколі, вакол Савецкага ўрада, вакол нашай бальшэвіцкай партыі, вакол свайго вялікага правадыра, вакол мудрага таварыша Сталіна, для новых і яшчэ нябачаных поспехаў працы ў прамысловасці і ў калгасах, для новых слаўных перамог Чырвонай Арміі на баявых франтах.

Аператыўная зводка генеральнага штаба Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі

20 верасня 1939 г.

На працягу 20 верасня, часці Чырвонай Арміі працягвалі цясніць польскія войскі і к канцу дня занялі:

На поўначы — ў Заходняй Беларусі гор. Гродна.

На поўдні — ў Заходняй Украіне гарады Ковель і Львоў.

За перыяд з 17 па 20 верасня, часцямі Чырвонай Арміі разбroена тры пяхотных польскіх дывізіі, дзве кавалерыйскіх брыг. і многа дробных груп польскай арміі. Захоплена ў плен, па далёка не поўным данным, звыш 60 тысяч салдат і афіцэраў. З поўным узбраеннем, артылерыяй і баяпрыпасамі, заняты ўмацаваныя раёны: Вільна, Барановічы, Маладэчна і Сарны. З многалікай ваеннай маёмасці покуль улічана: 230 арудзій і 120 самалётаў. Улік захвачаных трафеяў працягваецца.

21 верасня 1939 г.

Часці Чырвонай Арміі на працягу 21 верасня замацоўваліся на рубяжах дасягнутых напярэдадні. Працягваючы ачышчэнне занятых тэрыторый ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне ад астаткаў польскай арміі на поўдзень ад лініі Кобрын, Лунінец, часці Чырвонай Арміі у 19 гадзіне 21 верасня занялі горад Пінск і вядуць ачышчэнне ад афіцэрскіх груп раёнаў Львова і Сарны.

Вітаем рашэнне савецкага ўрада

21 верасьня ў памяшканні Польскага драматычнага тэатра адбыўся сход работнікаў тэатральнага мастацтва гор. Вільно. На сходзе прысутнічала 150 чалавек—артыстаў і работнікаў тэатраў Польскага драматычнага, Польскага музычна-аперэтачнага і яўрэйскага драматычнага тэатра.

З паведамленнем аб міжнародных падзеях і рашэнні савецкага ўрада аб аказанні брацкай дапамогі працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны выступіў прадстаўнік Часовага Ўпраўлення Віленскай Акругі тав. Клімаў.

Тав. Клімаў расказаў сабраўшымся аб геройстве байцоў і камандзіраў доблеснай Чырвонай Арміі, якая з радасным патрыятычным пад'ёмам выконвала свой інтэрнацыянальны доўг і вызваліла сваіх адзінакроўцаў братоў беларусаў і украінцаў ад гнёта і парабашчэння.

— Працоўныя Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны і ўсе народы Вялікага Савецкага Саюза з аднадушным адабрэннем сустрэлі рашэнне Савецкага ўраду працягнуць руку брацкай дапамогі працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны — гаворыць тав. Клімаў.

Тав. Клімаў заклікаў работнікаў тэатральнага мастацтва ўключыцца ў работу па абслугоўванню працоўных горада і байцоў Чырвонай Арміі. Затым на сходзе выступалі работнікі тэатраў.

З увагай было выслухана выступленне артыста яўрэйскага тэатра Абрама Морэўскага, які гаварыў аб вялікім значэнні для мастацтва вызваленне працоўных Заходняй Беларусі ад жахаў вайны і разарэння. На сходзе выступіў таксама з прамовай электратэхнік польскага драматычнага тэатра Зак і іншыя.

Удзельнікі схода прынялі рэзалюцыю.

РЭЗАЛЮЦЫЯ
Работнікаў тэатральнага мастацтва г. Вільно.

Заслухаўшы паведамленне прадстаўніка Часовага ўпраўлення Віленскай акругі тав. Клімава аб міжнародных падзеях і ўступленні часцей Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Зах. Украіну, калектыў работнікаў тэатральнага мастацтва цалкам і поўнасцю, аднадушна адабрае палітыку Савецкага ўрада, які працягнуў руку брацкай дапамогі працоўным Польшчы.

Мы вітаем гераічную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, якая вызваліла Заходнюю Беларусь і яе працоўных беларусаў, палякаў, яўрэяў і працоўных іншых нацыянальнасцей ад гнёта клікі панаваўшых класаў, ад гнёта нацыянальнага насілля і парабашчэння.

У панскай Польшчы пануючыя класы не давалі магчымасці развівацца тэатральнаму мастацтву. Тэатры былі вымушаны абслугоўваць толькі кліку правячых кругоў, а працоўных, для якіх і павінна існаваць тэатральнае мастацтва, былі пазбаўлены магчымасці наведваць тэатры.

Мы вітаем рашэнне Савецкага ўрада, які ўзяў пад сваю абарону лёс працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Мы работнікі тэатральнага мастацтва г. Вільно прыкладзем усе нашы сілы к таму, каб наша мастацтва служыла шырокім масам працоўных.

Будзем чэсна і аддана работаць на карысць развіцця тэатральнага мастацтва. На сцэнах сваіх тэатраў мы створым вобразы народных герояў, сапраўды народнага мастацтва. Будзем вучыцца тэатральнаму ма..стэрству ў артыстаў тэатраў Вялікага Савецкага Саюза.

Няхай жыве Савецкі ўрад і яго глава тав. Молатаў!

Няхай жыве Ленінска-Сталінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве правадыр працоўных усяго света таварыш Сталін!

Будзем жыць у брацкай сям'і народаў СССР

Дваццаць год працоўныя Заходняй Беларусі цярпелі гнёт польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Беларусы, яўрэі і працоўныя іншых нацыянальнасцей Польшчы былі пазбаўлены самых элементарных праў.

Працоўныя нацыянальных меншасцей Польшчы не мелі права гаварыць на сваёй роднай мове.

З вялікай радасцю працоўныя ўсіх нацыянальнасцей сустрэлі ўступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Яны ведаюць, што толькі Чырвоная Армія прынясе свабоду, дапаможа нам вызваліцца ад іга эксплаатацыі і парабашчэння польскіх паноў і капіталістаў.

Савецкі ўрад аказаў вялікую дапамогу адзінакроўным братам-беларусам і ўкраінцам, дапамогу вызваліцца ад гнёта памешчыкаў і капіталістаў. За гэта мы ўдзячны гераічнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Савецкаму ўраду.

Л. С. Цеслянскі,
С. А. Яцкевіч
рабочыя лесапільнага завода Эпштэйна.

ПАСТАНОВА № 1
Часовага Упраўлення Віленскай Акругі.

Кіраўнікі панскай Польшчы кінулі Беларускіх і Украінскіх нашых братоў, а таксама і працоўных другіх нацыянальнасцей, насяляючых Польшчу, у крывавую другую імперыялістычную вайну. Нацыянальны гнёт і закабаленне працоўных панаваўшымі класамі прывялі Польшчу да ваеннага разгрома.

Беларусы і Украінцы, а таксама і другія нацыянальныя меншасці на працягу 20 год выносілі цяжкі гнёт і пакуты нацыянальнага закабалення. Панская Польшча вяла адкрыты грабёж Беларускіх і Украінскіх працоўных. Працоўныя і прыгнечаныя Польшчы не маглі больш падтрымліваць урад пануючых класаў.

Байцы, камандзіры і палітработнікі доблеснай непераможнай адзінай ва ўсім свеце Рабача-Селянскай Чырвонай Арміі выканалі свой інтэрнацыянальны доўг, аказаўшы сваім адзінакроўным беларускім і ўкраінскім братам і працоўным усіх нацыянальнасцей Польшчы дапамогу вызваліцца ад гнёту, кабалы і насілля пануючых класаў.

У адпаведнасці з пастановай Ваеннага Совета Чырвонай Арміі беларускага фронта за № 1 на тэрыторыі Віленскай акругі ўлада перайшла часоваму Управленню Ваеннага Совета.

Часовае Управленне Віленскай акругі, у мэтах захавання рэвалюцыйнага парадку, пастанаўляе:

1. Прапануецца ўсім грамадзянам, пражываючым на тэрыторыі г. Вільно і Віленскай акругі на працягу 24-х гадзін здаць Часоваму Упраўленню ўсе віды агнястрэльнай і халоднай зброі, таксама ўсе боепрыпасы і ўзрыўчатыя вяшчэствы.

2. Для захавання рэвалюцыйнага парадку стварыць пры валасцях Віленскай акругі сялянскія камітэты, склад якіх зацвярджаецца акруговым часовым кіраўніцтвам. У задачы камітэтаў уваходзіць: арганізаванае із'яцце памешчыцкіх, царкоўных, манастырскіх зямель і зямель буйных чыноўнікаў і перадача іх У БЯСПЛАТНАЕ карыстанне сялянам-батракам, беднякам і сераднякам. На камітэты таксама ўскладаецца ахова ад расхішчэння, псавання і падпалаў маемасці (жывёлы, будынкаў, лясоў, ураджаяў і т. д.), належачай прыватным асобам, а таксама пакінутай збяжаўшымі фабрыкантамі, памешчыкамі, чыноўнікамі, і інш.

3. Для ўстанаўлення і захавання грамадскага парадку стварыць у г. Вільно ўзброеную рабочую гвардыю.

4. У мэтах забеспячэння нармальнага жыцця горада, прапануецца ўсім прыватным асобам і грамадскім арганізацыям, якія маюць сталовыя, рэстараны, магазіны, хлебапякарні, а таксама ўсім вытворча-прамысловым прадпрыемствам неадкладна прыступіць да работы.

5. Грашовыя аперацыі ў горадзе Вільно і акрузе праводзяцца савецкімі і польскімі грашыма па курсу: адзін савецкі рубель раўняецца аднаму злоту.

6. Катэгарычна забараняецца скліканне нарад, сходаў, дэманстрацый, друкаванне ўсіх выданняў без дазволу Часовага Упраўлення.

7. Асобы, заўважаныя ў парушэнні грамадскага парадку (грабёж, хуліганства і т. д.) будуць сурова карацца.

8. Свабоднае хаджэнне па г. Вільно дазваляецца да 8 гадзін вечара па мясцоваму часу.

9. Вінаўныя ў парушэнні гэтай пастановы будуць перадавацца ваенна-палявому суду і карацца па ўсёй строгасці ваеннага часу.

10. Часовае Упраўленне Віленскай акругі знаходзіцца ў памяшканні быўшай магістратуры.

Старшыня Часовага Упраўлення Віленскай акругі
Я. А. ЖЫЛЯНІН

20 верасня 1939 года, г. Вільно

Шчасце і радасць прынесла Чырвоная Армія народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны

ЗАХОДНІМ БЕЛАРУСАМ

Палілі вас агнём, знішчалі вас мячом,
Не смелі гаварыць вы моваю сваёй,
Вы плакалі крывёй пад панскім бізуном,
За вас хварэлі мы і сэрцам і душой.

Даволі слухаць больш пакутны спеў бароў,
За волю вы пайшлі, для любых ніў і сёл...
І беламу арлу, што падае на дол, —
Ніколі не ўзняць драпежных кіпцюроў!

Даволі мучыў вас пракляты польскі кат,
Руку братэрскую прымі, таварыш — родны брат!
Хай згіне польскі пан! Прабіў рашучы час!
Чырвоны, вольны сцяг навек з'еднае нас!

Заходні беларус! Ты вышаў грамадой,
Каб з намі паеднаць любімыя палі,
Бо мы адной сям'і, бо мы адной зямлі,
Нам з нашай маткай жыць—чырвонаю Масквой

Пятрусь Броўка.

Вызвалены народ

Сёлы, гарады Заходняй Беларусі. Усюды, даведаўшыся аб прыбліжэнні Совецкіх войск, к дарозе выходзяць жыхары. Яны з слёзамі радасці на вачах моцна пацікаюць рукі сваім братам, якія дапамаглі ім вызваліцца ад многагадовага панскага гнёту.

Аўтамашыны імчацца ўздоўж невялікай ракі. Сонечная восенская раніца. Перад намі на ўзгорках і балоцістых мейсцах вузкія, як шнуры палоск і ў беднякоў—беларусоў. Пакасіўшыяся маленькія халупкі. З другога боку — абшырныя палі памешчыкаў, вялікія маёнткі, пабудаваныя рукамі сялян.

Яшчэ здалёк відаць вялікі натоўп жыхароў. Яны з нецярпеннем чакаюць сваіх асвабадзіцеляў.

Мястэчка Паставы. На вуліцах весела і ўрачыста. Развіваюцца чырвоныя сцягі.

— Дваццаць год чакалі мы вас, дарагія таварышы. Але надзеі не пакідалі. І вось мы дачакаліся шчаслівага дня.

Насельніцтва горача дзякуе воінаў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Совецкі ўрад за вызваленне ад жахаў вайны і прыгнечання капіталістаў і памешчыкаў. Совецкія байцы падрабязна расказваюць аб сваёй социялістычнай радзіме — Вялікім Саюзе Совецкіх Социялістычных Рэспублік, аб шчаслівым і заможным жыцці Совецкага народа.

Па дарозе сустракаецца мноства беларусоў у форме польскіх салдат, якія зварачваюцца з фронта. Яны больш не жадаюць паміраць за паноў і капіталістаў.

— Добры дзень, таварышы-браты. Дзякуем за тое, што вызвалілі ад жахаў імперыялістычнай вайны і прыгнечання, стварылі магчымасць свабоднага жыцця і працы, — з такімі словамі сустракаюць праязджаючых чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў.

У многіх мясцовасцях Чырвоную Армію сустракаюць з кветкамі. Сяляне выносяць бойцам яблыкі, частуюць малаком.

На пляцы Вільна з чырвонымі сцягамі прыходзяць старыкі і моладзь. Чуюцца словы ўдзячнасці большэвікам і правадыру усіх працоўных таварышу Сталіну.

— Мы вас ужо даўно чакалі. Сэрцам адчувалі, што браты нам дапамагуць. Рабочыя, рамеснікі, работнікі інтэлігенцкай працы прыходзяць к месцам распалажэння войск, пацікаюць рукі, жадаюць благапалучча. Дзе толькі застановіцца баец, там адразу ствараецца натоўп. Кожны па свайму выражае пачуццё радасці. Распытваюць пра жыццё сваіх братоў-беларусаў. Расказваюць пра жыццё беларусаў, яўрэяў Заходняй Беларусі.

— Нам паны зусім па-іншаму гаварылі пра Совецкі Саюз, хоць мы і не верылі. Цяпер мы пераканаліся, якую сілу прадстаўляе Совецкая краіна і якое там шчаслівае жыццё.

З пачуццём вялікай радасці і ўдзячнасці працоўныя народы Заходняй Беларусі сустрэлі дапамогу сваіх братоў па класу з Совецкага Саюза.

Родная зямля аслабанёна ад польскіх паноў і памешчыкаў. Працоўныя Заходняй Беларусі, свабодныя ад гнёту і эксплаатацыі, пачынаюць будаваць новае, свабоднае жыццё.

Н. Валькевіч
І. Матыль

Пачалося новае радаснае жыццё

СТАЎБЦЫ (Заходняя Беларусь) 21 верасня (ТАСС). Яшчэ зусім нядаўна на пагранічнай станцыі Коласава высілася ўпрыгожаная чырвонымі сцягамі арка з надпісам: „Прывітанне працоўным Захада". Гэта арка ўжо не падзеляе беларускую зямлю на дзве часткі. Доблесная Чырвоная Армія назаўсёды вызваліла сваіх адзінакроўных братоў-беларусоў ад кабалы польскіх паноў і магнатаў.

У горадзе Стаўбцы забурліла новае, радаснае жыццё. Створана Часовае Гарадское Упраўленне, у склад якога ўвашлі мясцовы селянін І. Ф. Шастак, Гарадскі урач Н. Л. Грынбарг і інш.

У сваёй першай пастанове, расклеенай учора ў горадзе, Упраўленне даводзіць да ведама насельніцтва, што да асобага распараджэння будуць прымацца ва ўплату за тавары як совецкія, так і польскія грошы. Упраўленне заклікае насельніцтва горада арганізаваць бесперабойную нармальную работу ўсіх прадпрыемстваў, устаноў, крам. Створаны добраахвотныя атрады для падтрымання парадку, якім даручана ахова важнейшых аб'ектаў горада.

У горадзе адбылся 25 тысячны мітынг і дэманстрацыя. У радзе вёсак створаны сялянскія камітэты. Яны ужо ўзялі на ўлік землі памешчыкаў і асаднікаў. З вялікай радасцю вітаюць селяне вёскі Стары Сершан мерапрыемства мясцовага Часовага Упраўлення накіраваныя на ўздым дабрабыту працоўных селян.

У сваім пісьме Таварышу Сталіну селяне пішуць:

„Правадыру і настаўніку працоўных і прыгнечаных усяго света вялікаму Сталіну — наша гарачае прывітанне і дзякуй за вызваленне працоўных Заходняй Беларусі ад польскага гнёту".

Учора каля 150 чалавек упершыню пасля доўгагадовага беспрацоў'я пашлі працаваць на чыгуную станцыю і ў іншыя ўстановы горада.

—o—

Совецкія кінофільмы ў Заходняй Беларусі

ДЗІСНА. (Заходняя Беларусь). 21 верасня (ТАСС). Учора ў горадзе Дзісна на беразе Заходняй Дзвіны адбылася першая дэманстрацыя совецкага кінофільма. Тысячы працоўных з натхненнем глядзелі хвалюючыя вобразы з кінофільма „Ленін у 1918 годзе". Гледачы бурна апладыравалі пры з'яўленні на экране Леніна і Сталіна. Доўга раздаваліся воклічы: Няхай жыве Партыя Большэвікоў. Няхай жыве Вялікі Сталін!

Беларускае адзяленне саюзкінопракат накіравала для дэманстрацыі у гарады і вёскі Заходняй Беларусі 36 мастацкіх гукавых кінокарцін.

Працоўныя Заходняй Беларусі праглядзяць выдатныя совецкія кінакарціны „Ленін в 1918 годзе", „Чапаеў", „Мы з Кранштадта" і іншыя.

ПОСТАНОВА
Часовога Упраўлення Віленскай Акругі

21. IX. 1939 г. г. Вілно

I.

Аб фактах незаконнага павышэння цэн на тавары і прадукты

У апошнія дні наглядаюцца факты, калі асобныя прыватныя гаспадары магазінаў і складаў незаконна павышаюць цэны, хаваюць тавары, не пускаючы іх у прадажу, чым ствараюць штучныя цяжкасці ў забяспячэнні насельніцтва, як прадуктамі харчавання так і промтаварамі.

Часовае ўпраўленне пастанаўляе:

Папярадзіць усіх уласнікаў магазінаў. складаў, рэстаранаў і інш., што цэны на тавары і прадукты павінны заставацца на ўзроўне, існаваўшым да прыход учасцей Чырвонай Арміі.

Усякае павышэнне цэн і захаванне тавараў будзе разглядацца як спекуляцыя і варожае дзеянне, накіраванае супроць інтарэсаў працоўных.

Асобы, віноўныя ў спекуляцыі і незаконным павышэнні цэн будуць прэданы суду па законам ваеннага часу.

II.

Аб забароне із'яцця маёмасці без ведама Часоваго Ўпраўлення

Заўважваюцца выпадкі із'яцця маёмасці, належачай грамадскім арганізацыям і прыватным асобам пад відам па́трэбнасцей города.

Часовае ўпраўленне Віленскай Акругі пастанаўляе: катэгарычна забараніць із'яцце і канфіскацыю маёмасці ў грамадскіх арганізацыях і прыватных асоб кім бы то ні было без дазволу Часовага упраўлення Віленскай Акругі.

Асобы і арганізацыі, замечаныя ў дапушчэнні канфіскацыі і із'яцця маёмасці без дазволу Часовага Ўпраўлення Віленскай Акругі, будуць разглядацца як нарушыцелі грамадскага парадку і прыцягвацца к адказнасці па законах ваеннага часу.

III.

Аб рэгістрацыі аўтатранспорта

Часовае Ўпраўленне прапануе ўсім арганізацыям, установам, а таксама прыватным грамадзянам горада Вільно да 25 верасня зарэгістрыраваць увесь маючыйся ў наяўнасці аўтатранспарт.

Незарэгістрываны аўтатранспарт пасля указанага тэрміна будзе падлягаць із'яццю.

Рэгістрацыя праводзіцца ў памяшканні былога Магістрата з 8 гадзін раніцы да 2 гадзін дня па мясцоваму часу.

Старшыня Часовага Ўпраўлення Віленскай Акругі
Я. А. Жылянін

Паведамленне

Кансерваторыя імені М. Карловіча даводзіць до ўсеагулнага ведама, што нармальныя заняткі пачнуцца з 25 верасня г. г. ў памяшканні кансерваторыі (Велька, 8, тэлефон 14-38).

Дырэкцыя

Вайна ў Еўропе

Паведамленне вярхоўнага командвання германскай арміі

БЕРЛІН, 21 верасня (ТАСС), Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступную аператыўную зводку камандвання германскай арміі:

Усё яшчэ нельга канчаткова ўстановіць канчатковых рэзультатаў боя ля згіба Віслы, у раёне Вышэгруда, у другой палове дня 20 верасня колькасць польскіх палонных складае каля 170 тысяч. Лік палонных працягвае ўзрастаць. Толькі адной з 2-х удзельнічаючых у баях германскіх армій да гэтага часу захоплена 320 арудзій і 40 танкаў. У гэтых баях на польскім баку прымалі ўдзел згодна маючыхся вестак 9 дывізій, асобныя часці 10 іншых дывізій і тры кавалерыйскія брыгады.

На поўдні Польшчы пасля ажэстачоннага бою ля Санока і Томашова шматлікія польскія часці здаліся германскім вайскам. Захвачэны ў плен таксама галоўкамандуючы польскай паўднёвай арміі. Пачынаючы з 10 верасня ў гэтым раёне было ўзята ў палон 60 тысяч палякаў, захвачана 108 лёгкіх і 22 цяжкіх арудзій.

У баях ля Гдыні захвачана ў палон каля 350 польскіх афіцэраў і 12 тысяч салдат. Захвачана каля 40 арудзій.

Польскія войскі зараз аказваюць яшчэ супроціўленне ў Варшаве, ў Модліне, паўднёва-ўсходней ад Варшавы, у Гурэ Кальварыя і на поўвостраве Хела.

Прыбыццё польскага золата ў Англію.

РЫМ 21 верасня (ТАСС) Агенцтва Стефані паведамляе, што польскае золата, вывезенае нядаўна з Варшавы ў Бухарэст, перавезена зараз на барту англійскага судна ў Лондан.

Ваенныя дзеянні паміж Германіяй і Францыяй

ПАРЫЖ 21 верасня (ТАСС). Агенства Гавас паведамляе, на радыё з Парыжа вячэрняе комюнікэ ад 20 верасня аб ваенных дзеяннях на фронце. У комюнікэ гаворыцца: у розных пунктах фронта дзейнічала артылерыя праціўніка. Паміж французскай і германскай знішчальнай авіяцыяй адбылося некалькі сражэнняў. Адзін самалёт праціўніка збіты на лініі нашага фронта.

„Тан" аб ваенных дзеяннях на заходнім фронце.

БРУССЕЛЬ 21 верасня (ТАСС). Газета „Тан" ад 20 верасня ў аглядзе ваенных аперацый піша, што на працягу 2 дзён на фронце пануе адносны спакой. Прыток германскіх дывізій на захад можа ажыццявіцца ў шырокіх размерах толькі тады, калі ў Польшчы скончацца ваенныя дзеянні. Зразумела, што наш генеральны штаб дзякуючы французскай авіяцыі, будзе знаходзіцца ў курсе ўсіх спраў перасоўвання нямецкіх паяздоў і грузавікоў, якія накіроўваюцца да граніцы. Магчыма супроць гэтых чыста ваенных аб'ектаў пачнуць дзейнічаць бомбандыровачныя эскадрыллі англа-французскай авіяцыі, якая ўжо зараз знаходзіцца ў баявой гатоўнасці.

Нямецкае паведамленне аб зняцці з польскага фронта значнай часткі германскай знішчальнай авіяцыі і зенітнай артылерыі сведчыць аб імкненні немцаў забяспечыць абарону перасоўвання сваіх войск да заходняй граніцы.

Пераброска англійскіх войск ва Францыю.

ЛОНДАН, 21 верасня, (ТАСС). Парыжскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што англійскія войскі працягваюць прыбываць ва Францыю. Хаця і немагчыма даць указанне аб іх колькасці, піша карэспандэнт, тым не менш вядома, што дзякуючы аб'яднанай дзейнасці англа-французскага флота і паветраных сіл, англійскія войскі перабрасываюцца ва Францыю на зусім безапаснай зоне, ў якой выключаюцца якія-б то ні былі налёты ворага. Ў выніку наяўнасці такой безапаснай зоны значна палепшыліся таксама грамадзянскія паветраныя і марскія зносіны паміж двумя краінамі.

Пакуль што няма ніякіх вестак аб дзеяннях англійскіх войск ва Францыі. Але, як паведамляюць, французскія ўлады цалкам задаволены іх падрыхтоўкай і ўменнем вясці ваенныя дзеянні ў новых умовах.

Становішча на заходнім фронце

ХЕЛЬСІНГІ, 21 вересня (ТАСС) Ў тэлеграме з Парiжа газета „Хельсінгі" паведамляе, што бяздейнасць французкіх войск на заходнім фвонце, якая працягвалася звыш 60 гадзін там тлумачаць дрэнным надвор'ем. Акрамя таго заяўляюць, што неабходна даць адпачынак войскамі, якія ўжо на працягу 2 тыдняў трымалі ўдзел ў ваенных аперацыях

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

По паведамленням карэспандэнтаў ТАСС з Чунціна і Шанхая.

У цэнтральным Кітаі

У правінцыі Хувей, пачынаючы з 11 верасня, японскія войскі павялі наступленне на кітайскія пазыцыі. Кітайская абарона, аказаўшы рашучае супраціўленне адбіла наступленне ворага. Японцы страцілі забітымі звыш 2000 чалавек.

У паўночнай частцы правінцыі Цзянсі у раёне паміж Фынсінем і Гаоанем, пасля няўдалых японскіх атак наступіла зацішша. У раёні Ўпін-Жуйчан кітайскія партызанскія атрады, прасоўваючыся ва ўсходнім напрамку, перарэзалі Цэюдзян-Наньчанскую чыгунку ў раёне Махулінь.

15 вересня ў раёне Уніна кітайскія часці знішчыўшы больш 200 японцаў, захвацілі акопы ворага.

У паўночным Кітаі

У паўночнай частцы правінцыі Хенань на паўночным беразе ракі Хўанхе, кітайскія войскі 12 верасня занялі Шангуаньцунь, 14 верасня Цінян і Бэйсянчэй і 15 верасня Нюшічунь.

У паўднёва-усходняй частцы правінцыі Шаньсі 15 верасня кітайскія часці занялі Гутэн і Чуінкаў. У баях за гэтыя горады японцы згубілі звыш 500 чалавек. Вялікія баі ідуць ў раёне Хугуаня. У баях за гэты пункт японцы з 15 верасня згубілі не менш 800 чалавек.

У паўднёвым Кітаі

Паўднёва-заходней Кантона ў раёне Сіньхой-Хапін-Хэшать, з 19 верасня кітайскія войскі перайшлі к агульнаму наступленню. Па паведамленню газеты „Шуна-Бао" японскія войскі, наступаўшыя ўдоль Сіньхой-Хэшань разгромлены кітайскімі часцямі

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Адрэс рэдакцыі і друкарні Епіскопа Бандурскага 4. Тел. 79 і 99.